бібліятэкі. На мерапрыемстве прысутнічалі 6 сямей. Вядучыя прадставілі кожную сям'ю. Удзельнікі вечара дзяліліся вопытам выхавання дзяцей, расказвалі цікавыя моманты з жыцця сваёй сям'і, удзельнічалі ў гульнях, конкурсах, спявалі песні.

У сувязі з 600-годдзем заснавання Хоцімска і 55-годдзем вызвалення Хоцімшчыны ад фашысцкіх захопнікаў райвыканкам, РДК сумесна з бібліятэкай правялі свята горада “Мой родны Хоцімск”, на які былі запрошаны знакамітыя людзі – ураджэнцы Хоцімшчыны, старшыня аблвыканкама А.М.Кулічкоў, былыя кіраўнікі раёна, арганізацый і прадпрыемстваў. Многа гасцей было з суседніх раёнаў Магілёўшчыны і Расійскай Федэрацыі.

Дзіцячая раённая бібліятэка таксама праводзіць значную краязнаўчую работу сумесна з сярэднімі школамі райцэнтра. Аформлены кніжныя выставы: “Першае знаёмства з народнай скарбонкай”, “Зямля бацькоў нашых – погляд праз гады”. Праведзены краязнаўчыя чытанні “Зазірніце ў мінулае”, “Слаўныя імёны зямлі Хоцімскай”, гадзіна краязнаўства “Край над Бесяддзю”, гутарка па кнізе А.Кандрусевіча “Юныя героі Магілёўшчыны”, гульня-віктарына “Мой родны кут – мая Хоцімшчына” і іншыя цікавыя мерапрыемствы.

Вялікая работа па адраджэнні спадчыны праводзіцца ў сельскіх бібліятэках. Трасцінская бібліятэка, якая з'яўляецца базавай па краязнаўству, захоўвае багатыя матэрыялы аб Трасціншчыне і Хоцімшчыне, сабраныя вядомым у раёне краязнаўцам М.А.Ласоўскім. Гэтыя цікавыя матэрыялы выкарыстоўваюцца на пасяджэннях клуба “Спадчына”, які дзейнічае пры бібліятэцы. Былі арганізаваны літаратурная вечарына “Мова роднай зямлі – мова працы і жыцця”, вячоркі “У нашай вёсцы так спяваюць”, аформлены куток сялянскага быту і краязнаўчы куток.

Паглыблена і мэтанакіравана працавалі Ельнянская, Бярозкаўская, Баханоўская, Вялікаліпаўская і многія іншыя сельскія бібліятэкі, якія займаюцца вывучэннем абраднасці ў сваёй мясцовасці, зборам самабытных матэрыялаў сваіх вёсак.

Бібліятэкі праводзяць мерапрыемствы, якія садзейнічаюць укараненню ў быт нацыянальных свят і абрадаў, сярод іх такія, як вечар успамінаў “Дзе карані твае”, фальклорныя святы “Беларускія калядкі”, “На Купалу ночка мала”, беларускія вячоркі “Просім у хату, госцейкі нашы”.

У сувязі з 200-годдзем з дня нараджэння Адама Міцкевіча былі праведзены літаратурныя вечары “Мая душа – скарбонка пачуццяў”, “Слова для яго – жыццё”, “Паэтычны летапісец свайго часу” і іншыя.

У верасні ў бібліятэках раёна прайшоў Тыдзень пісьменства і друку, у праграму якога ўвайшлі гутаркі-агляды “З гісторыі пісьменства і друку”, гістарычны ўрок “Успомнім карані свае”, круглы стол “Беларускія асветнікі і першадрукары”, гісторыка-літаратурная кампазіцыя “Святло скарынінскіх кніг”, гадзіна цікавых паведамленняў “Як даўні скарб, як спадчына, нам даравана мова матчына”, гадзіна інфармацыі “Беларускі друк сёння”.

Усёй сваёй дзейнасцю па адраджэнні нацыянальнай спадчыны бібліятэкі Хоцімскай ЦБС імкнуцца ўплываць на развіццё пачуцця дачынення кожнага чытача да лёсу сваіх землякоў, любові да роднага краю, яго гісторыі, інтарэса да сучаснасці і адказнасці за будучае роднай бацькаўшчыны.

**SUMMARY**

The work of the Khotimskaja centralized library system on revival of a national heritage is considered in the article.

# Краязнаўчая работа ў Лідзе (20-я – 30-я гг.)

Аб поспехах і няўдачах краязнаўчай работы ў БССР у 20 – 30-я гады сёння вядома нямала. Нараджэнню сур'ёзных інтарэсаў у многіх людзей да мінулага роднага краю вельмі спрыяла абуджэнне нацыянальнай свядомасці беларусаў на працягу апошняга дзесяцігоддзя, пашырэнне інфармаванасці, паляпшэнне якасці выкладання гуманітарных дысцыплін у навучальных установах.

Аднак распаўсюджанне краязнаўства на заходнебеларускай тэрыторыі ў 1920 – 1939 гг. яшчэ мала даследавана. Як адносіліся заходнія беларусы да сваёй “малой радзімы”, ці імкнуліся пазнаць гісторыю зямлі сваіх продкаў, сучаснае жыццё і давесці гэтыя веды да новых пакаленняў?

У пошуку адказаў на гэтыя пытанні хочацца распавесці гісторыю 60-гадовай даўнасці з перадваеннага жыцця жыхароў Ліды. У гэтым невялікім горадзе навагрудскага павета (у верасні 1938 г. у ім налічвалася 26 257 жыхароў) не існавала буйных навуковых, асветных ці культурных цэнтраў. Аднак там жылі людзі, якія ведалі і шанавалі гісторыю краю, продкаў, імкнуліся зберагчы кожную адметнасць мінулага і сучаснага ладу жыцця і здолелі раскрыць гэтыя каштоўнасці для многіх людзей. Патрыётам горада быў бурмістр Юзэф Задурскі, дапамога якога спрыяла здзяйсненню важных краязнаўчых праектаў. У Лідзе, як і ў многіх гарадах і мястэчках Заходняй Беларусі, актыўна і плённа працавала краязнаўчае таварыства. Гарадская бібліятэка, у якой налічвалася 10 000 тамоў, была адной з лепшых агульнадаступных бібліятэк на заходнебеларускай зямлі. Сучаснікі адзначалі, што ў яе фондах былі навейшыя і лепшыя выданні сусветнай літаратуры, творы, вызначаныя высокімі ўзнагародамі: Нобелеўскімі прэміямі і інш. У фондзе мэтанакіравана быў выдзелены раздзел краязнаўчай літаратуры .

У 1935 г. быў арганізаваны выпуск выдатнага краязнаўчага часопіса

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ВАЛЯНЦІНА САІТАВА

“Лідская зямля” (“Ziemlia Lidzka”, да 1939 г. называўся “Ziemlia nasza”). Часопіс выходзіў штомесячна на польскай мове пад рэдакцыяй вядомага краязнаўца Уладзіслава Абрамовіча. Глыбокая любоў да родных мясцін, талент гісторыка, літаратара і выдатнага арганізатара дапамаглі яму сабраць кола адменных аўтараў, сярод якіх быў і сам рэдактар. Менавіта У.Абрамовічу належыць цудоўная кніжка “Strony Nowogrodzkie” (“Навагрудскія мясціны”), якая атрымала 3-ю прэмію на літаратурным конкурсе, праведзеным прафесіянальным саюзам польскіх пісьменнікаў у Вільне.

У “Лідскай зямлі” былі апублікаваны дзесяткі арыгінальных, цікавых артыкулаў па гісторыі Ліды і яе наваколля, па гісторыі вызваленчых і палітычных рухаў, аб асаблівасцях укладу мясцовага жыцця, народных звычаях, эканамічным стане і іншых пытаннях. Часта друкаваліся ў часопісе найлепшы знаўца краю Міхал Шымелевіч, Аляксандр Сняжко, Удадзімір Галубовіч. З артыкулаў часопіса паўставала гісторыя вёсак, маёнткаў, мястэчак, культавых устаноў усіх канфесій, распавядалася пра даследаванні курганоў і другіх археалагічных і архітэктурных помнікаў, трагічныя падзеі паўстання 1863 – 1864 гг., ваенных дзеянняў 1918 – 1921 гг., асвятлялася самае шырокае кола сучасных праблем: стан сельскай гаспадаркі, эканамічнага жыцця горада, культуры. Напрыклад, у артыкуле М.Шымелевіча “Горад Ліда ў 1938 годзе” прадстаўлена падрабязнейшая характарыстыка эканомікі, бюджэта горада і яго выкарыстання, адміністратыўнай сістэмы, этнічнага, сацыяльнага, прафесіянальнага і канфесіянальнага саставу яго жыхароў. З выключнай увагай у часопісе ставіліся да славутасцей лідчыны і навагрудчыны. Вялікая колькасць публікацый была прысвечана даследаванню сувязей Адама Міцкевіча з краем: сям'і паэта, яго дзяцінству, каханню да Марылі і яе лёсу, наведванню навагрудчыны сынам Вацлавам і многім другім аспектам, а нумар 9 за 1938 г. цалкам прысвечаны гэтай тэме ў сувязі з правядзеннем свята “Міцкевічавых дзён”, калі журналісты з усёй Польшчы прынялі ўдзел у краязнаўчай экскурсіі па навагрудскіх памятных мясцінах. Знаходзілі адлюстраванне і лёсы іншых людзей, якія пакінулі карысны ці памятны след на роднай зямлі.

Артыкулы ў “Лідскай зямлі” вызначаюцца навуковай грунтоўнасцю, адным з фактараў дасягнення якой было шырокае выкарыстанне даследчыкамі краю літаратуры, архіўных дакументаў і іншых крыніц. Многія артыкулы змяшчалі дзесяткі бібліяграфічных спасылак на польскія, рускія, беларускія і выданні на іншых мовах, публікацыі навуковай, даведачнай, мемуарнай і іншай літаратуры незалежна ад часу і месца яе выпуска, на архіўныя друкаваныя і рукапісныя матэрыялы. Сярод крыніц нярэдка называліся бібліяграфічныя дапаможнікі.

У раздзеле “Бібліяграфія” друкаваліся рэцэнзіі, рэкамендацыйныя анатацыі, водгукі, агляды новых кніг і перыядычных выданняў, якія прадстаўлялі навуковую і пазнавальную цікавасць для чытачоў “Лідскай зямлі”. Рэдакцыя ўважліва сачыла за новай літаратурай пра лідчыну і суседнія мясцовасці. Узровень ацэнак быў вельмі высокім і аб'ектыўным. Так, аўтар агляду “Запісак Беларускага навуковага таварыства” (Вільня, 1938) вельмі трапна звярнуў увагу на псеўдабеларускую мову аўтараў некаторых артыкулаў зборніка і раіў ім звяртацца да выдадзеных актаў Літоўскай метрыкі – “сапраўднай скарбніцы фанэтыкі, марфалогіі і слоўніка беларускага”. Вельмі добразычліва аўтар агляду выказаў спадзяванне, што карысная навуковая праца Беларускага навуковага таварыства будзе працягвацца.

У апошніх гадавых нумарах змяшчаліся паказальнікі зместу часопіса. Асобныя раздзелы яго ўтваралі пералік артыкулаў, матэрыялаў гадавой хронікі, прац, разгледжаных у бібліяграфічным раздзеле, спіс ілюстрацый. Матэрыял у кожным раздзеле паказальніка адлюстроўваўся вычарпальна, гэта добра спрыяла больш хуткаму і поўнаму выяўленню неабходнай чытачу інфармацыі.

Бібліяграфічны характар меў таксама раздзел “Кнігі, прысланыя да рэдакцыі”, у якім змяшчалася бібліяграфічнае апісанне твораў друку, маючых краязнаўчы змест.

Часопіс меў добрае паліграфічнае афармленне, вялікі фармат і змяшчаў каштоўныя і цікавыя ілюстрацыі. Гэта былі фотаздымкі герояў артыкулаў, памятных мясцін і прадметаў, ілюстрацыі з карцін і іншыя матэрыялы. Рэдакцыя імкнулася прадставіць чытачам асабліва каштоўныя, рэдкія ілюстратыўныя матэрыялы. Напрыклад, у 1938 г. у часопісе было надрукавана 57 артыкулаў і змешчана 34 ілюстрацыі. У трывожным 1939 г. фармат часопіса паменшыўся, нумар шосты за чэрвень быў апошнім (па даных Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі).

Часопіс “Лідская зямля” быў папулярным сярод мясцовага насельніцтва. Ён спрыяў абуджэнню пачуццяў любві да роднай зямлі, імкнення ведаць яе і зыскаў павагу і высокую ацэнку як лепшы краязнаўчы часопіс у Заходняй Беларусі і нават у Польшчы. Заслуга часопіса была і ў згуртаванні мясцовай інтэлігенцыі і прыцягненні яе ўвагі да даследавання роднага краю. У Лідзе выходзілі кнігі і перыядычныя выданні, напрыклад, у 1938 г. выйшлі два нумары перыядычнага выдання “Лірнік вясковы”, прысвечанага паэзіі і народнай літаратуры, заснавана “Газета лідска”. Рэдакцыя часопіса выдала таксама шэраг кніг пра лідчыну (Ю. Дзічканец “Самаабарона зямлі лідскай”, А.Сняжко “Касцёл фарны ў Міры” і іншыя). У № 6 за 1939 год на 4-й старонцы вокладкі змешчана бібліяграфічная інфармацыя пра 6 выдадзеных на аснове часопіса краязнаўчых кніг. У 1938 г. моладзь другога класа дзяржаўнай гімназіі імя гетмана К.Хадкевіча пад кіраўніцтвам настаўніцы Юзэфы Клейндэнстовэй правяла з вялікім поспехам краязнаўчую вечарыну. Рыхтуючы мерапрыемства, вучні сабралі шмат матэрыялаў пра бытавыя звычаі і абрады сельскіх жыхароў, выкарысталі этнаграфічныя артыкулы М. Шымелевіча з часопіса “Лідская зямля”. У інфармацыі пра вечарыну асабліва падкрэслівалася, як ўдала спявалі “артысты” беларускія песні. Невыпадкова 28 мая 1939 г. у Лідзе ўрачыста адкрыўся музейны асяродак аддзелу Польскага краязнаўчага таварыства, які разглядаўся як зачатак будучага музея лідскай зямлі. Аб часопісе пісалі ў іншых перыядычных выданнях, паведамлялі па радыё ў Вільні і Баранавічах. Значэнне “Лідскай зямлі” чуйна выразіў вядомы спецыяліст па краязнаўству прафесар Віленскага універсітэта М.Ліманоўскі, напісаўшы, што часопіс “спрабуе адваліць магільную пліту забыцця з лідскай зямлі і на свет дзённы дастаць багацці гэтай зямлі.”

Сёння азнаямленне з матэрыяламі “Лідскай зямлі” дасць нямала хвалюючых уражанняў. Часопіс багаты цікавейшай інфармацыяй для ўсіх, хто імкнецца паглыбіць свае веды пра лідчыну і навагрудчыну. На жаль, у буйнейшых бібліятэках Мінска няма поўнага камплекта гэтага выдатнага часопіса. Магчыма, бібліятэкары і краязнаўцы Ліды і Навагрудка здолелі сабраць усе яго выпускі як каштоўную крыніцу краязнаўчай інфармацыі.

SUMMARY

The article is devoted to the study of the local lore in Lida (1920 -- 1930).



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ